Прыкладам пераймання кампазіцыйнага і тэхнічнага вырашэння гравюр у сучасным мастацтве з`яўляюцца ілюстрацыі Яўгена Куліка, калі аўтар мэтанакіравана імкнуўся ўзнавіць аблічча старажытных дрэварытаў [6]. У іншых выпадках гравюры з`яўляюцца мастацка-вобразным і дакументальна-гістарычным падмуркам пры распрацоўцы канцэпцыі твора на гістарычную тэматыку. Сярод сучасных аўтараў, якія выкарыстоўваюць пратографы ў сваёй творчасці, можна прыгадаць графікаў Міколу Купаву, Міхася Басалыгу, Паўла Татарнікава; жывапісцаў Уладзіміра Тоўсціка, Аляксея Марачкіна; скульптараў Святлану Гарбунову, Генадзя Лойку; мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Тамару Васюк і інш.

Старажытныя эстампы служаць выразнікамі свайго часу, носьбітамі мастацкіх, рэлігійных, сацыяльных ідэй. Эстэтычная, стылістычна-вобразная і дакументальна-гістарычная каштоўнасць гравюр спрыяюць таму, што зварот да іх, як да неабходнай крыніцы, адбываецца на працягу амаль 5 стагоддзяў: пачынаючы з простага пераймання ў 16 стагоддзі да глыбокага грунтоўнага пераасэнсавання, мастацкага і гістарычнага аналізу на сучасным этапе.

**Літаратура**


1. *Шматаў В. Ф.* Мастацтва беларускіх старадрукаў (XVI – XVIII стст.) – Мн.: Тэхналогія, 2000. – 131 с.
2. *Высоцкая Н. Ф.* Искусство Беларуси 12–18 вв. – Мн., 2004. – 26 с.
3. Іканапіс Беларусі XV – XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 2001. – 21 с.: [139] арк. іл
4. *Гаршкавоз В.* Касцёлы святога Францыска Ксаверыя // Мастацтва Беларусі. – Мн.: Полымя, 1996.–№8 – с.43-47
5. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII – XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 1984. – 15 с.: [174] арк. іл.
6. *Баразна М. Р.* Беларуская кніжная графіка 1960-1990-х гадоў / М.Р.Баразна; Маст. Баразна М.Р. – Мн.: БелЭН, 2001. – 208 с.: іл.


©ПГУ

## ВЕРАЦЯРПІМАСЦЬ І РЭЛІГІЙНАЯ УНІФІКАЦЫЯ: АНТАГАНІЗМ І ЎЗАЕМНЫ ЎПЛЫЎ

***В. У. ЧАРАЎКО*, Д. У. ДУК**

Article is devoted to interrelation between tolerance and religious unification in the Great Lithuanian Principality

Ключавыя словы: ВКЛ, талерантнасць, праваслаўе, каталіцтва, Рэфармацыя

Канфесійная гісторыя Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) можа разглядацца як узаемадзеянне дзвюх мадэляў рэлігійных адносін – верацярпімай і уніфікуючай [1, с. 19]. Згаданыя мадэлі відавочна антаганістычныя і неаднаразова змянялі адна адну. «Паганская талерантнасць» у 1387 г. саступіла месца рэлігійнаму радыкалізму, той у 1447 г. змяніўся біканфесійна-парытэтнай талерантнасцю, якая з часам развілася ў поліканфесійную талерантнасць (з 1563 г.). На змену апошняй у 1596 г. прыйшло каталіцка-уніяцкае дамінаванне [2, с. 38–39].

Рэлігійная гісторыя ВКЛ дае прыклад і даволі нечаканага ўзаемнага ўплыву верацярпімасці і уніфікацыі. У 1439 г. была заключана Фларэнтыйская царкоўная унія [3, с. 703]. Ад імя праваслаўнай царквы ВКЛ пагадненне падпісаў мітрапаліт Ісідор. У ВКЛ унію праігнаравала большасць праваслаўнага духавенства. Супраць выступілі каталіцкія іерархі і вялікі князь, якія прызнавалі не папу Яўгена IV, а антыпапу Фелікса V. Унія не мела поспеху ні ў свеце, ні ў ВКЛ. Аднак яна мела адно важнае ідэалагічнае наступства – нагадала вярхоўнай уладзе, што і католікі, і праваслаўныя належаць да хрысціянства. Адсюль бярэ пачатак ураўнаванне галоўных канфесій ВКЛ у XV ст. [3, с. 703]. Натуральна, галоўную ролю адыграў рэальны расклад сіл, аднак гэты ідэалагічны момант таксама меў пэўнае значэнне. Уніфікацыя паспрыяла развіццю верацярпімасці.

«Залатым векам» назваў XVI ст. Фёдар Еўлашоўскі, які меў на ўвазе панаваўшую ў той час рэлігійную талерантнаць [4, с. 484]. Размова ідзе аб поліканфесійным варыянце верацярпімай мадэлі, росквіце талерантнасці ў Вялікім княстве Літоўскім. Гэтаму росквіту паспрыяла Рэфармацыя. У выпадку поспеху яна, аднак, вяла якраз да адваротнага – да уніфікацыі. Сам па сабе пратэстантызм не больш схільны да верацярпімасці, чым праваслаўе або каталіцтва. Пашырэнне Рэфармацыі ў ВКЛ адбывалася менавіта за кошт каталіцкага касцёла і праваслаўнай царквы. Калі ўлічыць, што ад пачатку масавага распаўсюджвання пратэстантызму да поўнага ўраўнаваня яго прыхільнікаў у правах з католікамі прайшло ўсяго дзесяць гадоў (праваслаўная царква не магла дабіцца гэтага больш за паўтара стагоддзя), зразумела, што наступнае дзесяцігоддзе магло стаць для касцёлу ў ВКЛ апошнім. Далейшае ўмацаванне пратэстантызму павінна было прывесці традыцыйныя «грэчаскую» і «лацінскую» канфесіі да поўнага заняпаду.

«Бліцкрыг» Рэфармацыі быў сарваны контррэфармацыяй. Контррэфармацыя – з’ява відавочна уніфікуючая. Аднак сутыкненне з магутным посттрыдэнцкім каталіцтвам прыпыніла экспансію

пратэстантызму. Пратэстантызм, у сваю чаргу, пэўны час стрымліваў распаўсюджванне каталіцтва. Утварылася раўнавага паміж веравызнаннямі, з-за чаго поліканфесійная талерантнасць працягвала існаваць [1, с. 20].

Такім чынам, узаемадзеянне верацярпімасці і уніфікацыі ў значнай ступені вызначыла спецыфіку рэлігійных працэсаў у Вялікім княстве Літоўскім.

**Літаратура**


1. *Чараўко В. У.* Дзяржава і рэлігійныя плыні ў Вялікім княстве Літоўскім: прынцыпы ўзаемадзеяння// Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета/ Вып. 14. – Новополоцк, 2006. – С. 19-21.
2. *Чараўко В. У.* Рэлігійная гісторыя Беларусі: эпохі, этапы, перыяды// Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета/ Вып. 10. – Новополоцк, 2005. – С. 37-40.
3. *Белы А.* Фларэнтыйская унія// Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч/ Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 2006. – С. 703.
4. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: IX – першая палова XVIII ст./ НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; Падрыхт. А.І. Богдан і інш. Навуковы рэдактар В. А. Чамярыцкі. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 1015 с.


©БГУКиИ

## ХУДОЖЕСТВЕННАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСИ КАК ПОГРАНИЧНОЕ КРЕАТИВНОЕ ПРОСТРАНСТВО

***Т. В. ШЕЛБАНОВА*, Ю. Г. БОЛОТОВА**

In article the art culture of Belarus is considered from a positions of dialogical and creative approaches

Ключевые слова: художественная культура, креативность, диалог

Глобальные изменения, происходящие в настоящее время на различных уровнях и в различных сферах жизнедеятельности человека, динамичность и глубина преобразований окружающей действительности, непрерывно расширяющееся информационное пространство и другие процессы способствуют повышению активности человека как творца особого мира культуры. Художественная культура – область деятельности человека, представляющая собой совокупность процессов и явлений духовно-практической деятельности, благодаря которой создаются, хранятся и транслируются произведения искусства и материальные предметы, обладающие эстетической ценностью.

Диалогичность и креативность являются определяющими факторами формирования, развития и динамики белорусской культуры вообще и белорусской художественной культуры в частности. Диалог – одна из форм согласования различных культурно-исторических традиций, условие появления новых художественных ценностей. Диалог строится на границе оппозиций «глобальное – локальное», «современное – традиционное», «западное – восточное» и т.д., во взаимодействии между ними и образовании в результате некоего мид-пространства. Наиболее очевидным диалогизм белорусской художественной культуры, становился в т.н. переломные, судьбоносные моменты отечественной истории культуры. Такими «точками отсчета», по нашему мнению, стали:

- древнебелорусский период – период формирования основ и сущностных характеристик белорусской культуры. В это время происходит формирование белорусской художественной традиции в русле восточнославянских культурных традиций, характерен синтез язычества и христианства и, как итог, возникновение т.н. «двоеверного синкретизма», имевшего значительные для Беларуси последствия.
- белорусское Возрождение и Реформация – эпоха трансформации доминирующих ориентиров культуры. На развитие художественной культуры Беларуси этого периода оказывают сильнейшее влияние ренессансные представления о мире и человеке, которые были распространены в Западной Европе. Вместе с распространением гуманизма в искусство Беларуси проникают индивидуалистические тенденции, формируется представление о самоценности человеческой жизни, о приоритете светской власти над духовной. Белорусская художественная культура выступает в качестве медиатора, посредника между искусством Запада и Востока. Так через территорию Беларуси и Украины в Россию проникают новые художественные стили.
- современный период (XX–XXI вв.) – время формирования глобального информационного и культурного пространства. С одной стороны, белорусская культура впервые развивается в условиях суверенного белорусского государства. С другой – XX в. представляет собой достаточно долгий и неоднозначный период, связанный с осознанием места и роли белорусской культуры в контексте мировой и европейской культуры. Постепенно формируется национальная художественная школа, развиваются белорусские национальные традиции.

Художественная культура Беларуси современного периода полифонична. Кросс-культурное пространство Беларуси является пространством «встреч» разнородных художественных явлений. На примере Беларуси мы видим, скорее, реализацию не столько классического диалога, сколько полилога.